Адзін месяц 2000 году

Вячеслав Владимирович Адамчик


SHOUT
SHARE
IT

- Вячаслаў Адамчык

Вячаслаў Адамчык
Адзін месяц 2000-га году
Дзённікавыя запісы

Субота, 1 студзеня 2000 году.

Новы век, а за акном ціхутка плыве ў лёгкім кружэньні і пагойдваецца той самы сьнег. Пухкі і белы, як “бабіна лета”. І мужчына пад ім пайшоў, напаўкроку ступаючы, нібы намацваючы гузаватую наледзь. Але ўжо іншы, ня той, што кожнае раніцы сунуўся тутэйшым завулкам, нізка апусьціўшы на вочы вайсковую фуражку. Болей як паўгода таго я ўжо ня бачу.

Падумалася: колькі людзей адышло і засталося ў тым веку, але ж колькі іх, помсьлівых і варагаватых, засталося для новага стагоддзя.

Нядзеля, 2 студзеня 2000 году.

9.30. Пад цяжкім полагам шчытнай хмары вузкая палоска прозалаці. Карычнева-белыя балонкавыя дахі. Охравыя дамы з цёмна-зеленаватымі чатырохкутнікамі вокнаў. –5 ˚С. Пры ранішняй цішыні, калі чуваць толькі, як палускваюць у вясковых драўляных хатах вуглы. Нанач злосны і зайздросны акадэмік — цэнзар Нікіценка. Як кожны ўгодлівы хахол, ненавідзеў незалежнікаў-украінцаў (“сепаратыстаў” Данілеўскага і Кастамарава), Ганчарова называў “эгоистом, трусом и завистником”, які на службе палучае 4000 руб. у год.

Лютая нянавісць да п[а]лякаў: гэтая нацыя мусіць быць вынішчаная.

Пад чорнаю ліпаю ў двары сумуюць новенькі зялёны, як жук, “мерседэс” і старэнькі сьветла-блакітны “кадэт”. І мяне зманьвае спакуса куды-небудзь ехаць. У нялюдным прыгарадным. Але дарогі няма.

У душы спакой. Але я яшчэ маральна не гатовы, каб узяцца за творчае. Таму хаджу кругамі каля свайго стала. Гартаю выпадковыя і даўно прачытаныя кніжкі і ніводнай не дабяру пад свой густ.

Магазін. Два пакеты малака па новых цэнах. Ці, дакладней, цэны тыя самыя, толькі на грошах скрэсьленыя тры нулі.

Мройны, вялы сьнег за вакном. Плыве і плыве на карычневыя паласатыя дахі. А яны ўжо, здаецца, пачынаюць мокра блішчаць каля шарых каміноў.

Прыгадаўся белы дом, дзе ў часе вайны кватаравалі яшчэ польскія чыгуначнікі. Там жыў мой аднакласьнік і равесьнік Тосек Інгілевіч, віхрасты, чарнявы хлопчык, нечым падобны да каўказца. Ідучы ў школу, бо мне было па дарозе, я заходзіў да іх у кватэру. І яго маці, высокая, хударлявая кабета, выпраўляючы з дому, хрысьціла нас і прыгаворвала па-польску кароценькую малітву. І вось загадка: ці ўсьцерагла Тосека (Антона) гэтая матчына малітва і ці жыве ён? Бо пасьля вайны з першым жа эшалонам палякаў і беларусаў, што ехалі на “адзысканыя землі” (былыя нямецкія), зьнікла і сям’я Інгілевічаў. І ня толькі іх. Шмат тады маіх равесьнікаў і аднакласьнікаў апынулася ў Польшчы. І нашая сям’я рыхтавалася да ад’езду, але заўпарціўся бацька.

Пад’юшчвае і спакушае тэма пра салдата-беларуса, што, прайшоўшы вайну ў польскім войску, атрымаў нямецкі надзел — спраўную гаспадарку — і клікаў да сябе з-пад Нарачы шматдзетную сям’ю. Але жонка збаялася ехаць у незнаёмую дарогу і на новае жыхарства з чатырма малымі дзецьмі. І вось праз колькі гадоў (дзесяць, пятнаццаць) ён прыязджае ў адведкі. Яго паклікала, паслаўшы запрашэньне, самая малодшая дачка, якая ня помніла бацькі і ня мела на яго крыўды. Можа, у такім рэчышчы павесьці апавяданьне “Смаркуля”.

Доўгія і нудныя лісты старога Ганчарова да маладых дочак Нікіценкі.

Яго хваравіта-помсьлівае змаганьне з Тургеневым за плагіят: некаторыя сцэнкі ці матывы з “Абломава” заўважаныя ў “Дваранскім гнязьдзе”. Тургенеўскі Лаўрэцкі падобны да ган[ч]ароўскага Райскага (“Звычайная гісторыя”).

Гэта мне нагадала нараканьне Пташнікава за перапісанага з яго аповесьці і ўстаўленага Чыгрынавым у свой раман “Апраўданьне крыві” знакамітага лася. Пташнікаў нават меўся падаць скаргу ў Прэзідыум Саюза пісьменьнікаў. Але чамусьці стрымаўся, затаіўшы сваю крыўду і злосьць.

Яшчэ, здаецца, перад Новым годам адзін з супрацоўнікаў “Полымя” расказаў мне гісторыю напісаньня аповесьці, калі непадуладная яму гераіня здрадзіла мужу, і ён усю гэтую сцэнку ў сваім уяўленьні перанёс на жонку і пачаў па-належнаму ўжо падазраваць яе ў спраўджанай нявернасьці.

Напісаньне аповесьці, вядома, прыйшлося спыніць, каб ужо самому не захварэць псіхічна.

Панядзелак, 3 студзеня 2000 году.

9.10. Бронзава-зялёны “мерседэс”, што стаяў пад чорнаю

ліпаю, пакінуўшы цёмны чатырохкутнік на белым сьнезе, ужо зьнік. На ліпе сумуе толькі прыгорбленая сівая варона.

Панылы ранак з цяжкім сівым небам і белымі дахамі.

Сёньня да паўночы — успаміны ад'ютанта пра сьмерць маршалка Пілсудскага. Нямоглы, зьнябожаны, змучаны хваробаю (рак печані) пан маршалак нчэльны вудз праклінае польскі народ. Яны, дыктатары, любілі, пэўна ж, толькі сябе, сваю велічнасьць і славу… і зьмену жонак з каханкамі.

11.30. Зноў хада па зачараваным крузе: паштамт (пенсія), магазіны. А аўсяных пласьцікаў (шматкоў) так і не купіў — няма. Жывём, як у савецкі час: зьнікне тавар, і ўжо з агнём яго ня знойдзеш.

Каля паштовага акенца, у якім выдавалі пенсію, кляцьба і крык бабулек. Яны ніяк не прывыкнуць, што на грашовых купюрах перакрэсьленыя тры нулі. Купюры тыя самыя, але вартасьць іх паменшылася ў тры разы.

А ўсе яны, старыя і неразборлівыя, падманутыя індычаю балбатнёю Л. (…). Але — каб толькі яны, а насланы за доўгія гады Масквою акупацыйны элемент, вайсковы і цывільны?

"Глобус" (газетна-часопісны кіёск пры паштамце) быў зачынены, і я, дарэчы, не даведаўся, ці выйшаў з друку дванаццаты нумар "Маладосці".

Навуменка ў прозе голы, як сьвяты турэцкі.

Баязьліва, але намацваю сьцежку да апавяданьня "Смаркуля". Хоць назва з чужога пляча не падыходзіць. "На старым жвіровішчы" — традыцыйна. А "Зварушаны камень"? Можа, трохі лепш.

Аўторак, 4 студзеня 2000 году.

11.20. Сівое неба апусьцілася ніжай, схаваўшы нават ветразі асьвятляльнікаў, і макрэюць дахі. З іх спаўзае волкі сьнег. +1 °C.

Учора Валодзя з камп'ютэрным адбіткам майго "Радаводу" і бутэлькаю "Генерала". Сёньня перажываю, каб не зашкодзіла яму чарка і каб ён ня зьбіўся з тропу.

Зьбіраюся напытаць у кіёсках Саюздруку "Маладосць" з сваёю публікацыяй. Кажуць, дванаццаты нумар выйшаў.

Валодзя намякаў пра свой артыкул аб трох Адамовічах. Трэба было б пачытаць, але наўрад ці куплю ўжо "Нашу Ніву" — газета даўно разышлася.

13.00. Як кажуць, адбіў ногі, абышоўшы ўсе тутэйшыя газетныя кіёскі, а "Маладосці" не купіў. У "Падпісных выданьнях"

натрапіў [на] два нумары “Arche” са сваімі апавяданьнямі.

“А “Маладосць” да нас не паступае”, — сказала прадаўшчыца ў белай будачцы, што стаіць на тратуары каля банку.

Трымаючыся за тыраж у дзьве з палавінаю тысячы адбіткаў, можна пайсьці на дно. Прычынаў, вядома, шмат. А ня менш вінаватая і рэдакцыя, якая, утуліўшы ціхенька галаву ў плечы, не зварухнецца з месца. Усяго і клопату, каб зазірнуць у кілішак. Год-два, і выданьне можа адысьці на вечны спачын. Шкада.

14.00. Блішчыць, як пацямнелае цынкавае вядро, мокры мансардавы дах на жоўтым доме — там, растаючы, белымі апольцамі зьехаў сьнег. І разам з дажджом сыпле новы. Слота. На тратуарах раскіслая, зеленаватая, як жабіна ікра, сьнежная каша. І сотні ног яе месяць, а з-пад колаў машын уздымаюцца вееры ржавай вады. Сьнег засыпае мяккім, як пенапласт, покрывам маўклівую вечнасьць зраўняных з зямлёю магілаў, пакідаючы нам жорсткую і супярэчлівую рэальнасьць жыцьця: холад, голад, войны. І перанаселены ўжо чалавекам сьвет. Пакорным і непакорным, злым і добрым.

Каля Міністэрства сельскай гаспадаркі, дзе плойма аўтамабіляў замежных марак, — насустрач мне кабета ў сінім паліто са зморшчаным тварам. Трохі падумаўшы, пазнаў былую студэнтку філфаку БДУ. І ўсьміхнуўся сам сабе, прыгадаўшы, як біліся за генеральскую дачку двое нашых хлопцаў — студэнтаў журфака.

Дзіва бярэ — зморшчаная старая кабета і абношаная. Нічога на ёй і тады, у студэнцкія гады, не было. Ні хараства, ні паставы, адзін толькі тытул — “генеральская дачка”.

А яны, абое вясковыя дурні, счубіліся за яе біцца, і нават на сьмерць — чайнікамі з вадою. Адась Тычына і Сеня Мурашка.

Які часопіс ні разгарні, усюды відаць дзятлаў нос савецкага Б.
(…)

Серада, 5 студзеня 2000 году.

8.50. Нагнуўся і пачаў падаць у ванну. Так кружыцца галава. Ня мог нават пагаліцца. А ў Ніны сьвята. Ці не хваціла Новага году і Калядаў?

Не ўпусьціць з-пад увагі словы, якія варт[а] было б ужываць: пэўна, прынамсі, калываўся, рупіць напісаць, карцела паслухаць.

— Прынамсі, так.

— Зрэшты, так.

— Пэўна ж.

— Борзьдзенька.

Захліснуўся.
Як хлясьне.
Кагадзе.
Нудота.

Чацьвер, 6 студзеня 2000 году.

9.30. Хвароба мая не прайшла — у ложку не перавярнуцца. Сёньня ўночы акно кружылася, як крыло ветрака. Не памагае і цынарызін.

Учора, пераходзячы вуліцу, ледзьве не самлеў, так падкошваліся ногі.

А сёньня трэба дабрацца ў Дом прэсы па ганарар. Ня варты ён і хворае хады, бо плоцяць для блізіру. Усе грошы ідуць на сілавыя структуры і на ахову Л. (…).

Слабасьць у нагах — ледзьве хаджу. Несьціханы боль галавы.

Ледзьве жывы даехаў да Дому прэсы, там папрэў у чарзе, каб пачуць, што сёньня ганарар выплачваць ня будуць. (Чамусь баліць правая рука, цяжка пісаць.) За тою голаю косткаю, што табе кідаюць, як галоднаму і апошняму сабаку, трэба валачыцца яшчэ некалькі разоў.

Каб не згубіўся пачатак новага апавяданьня “Зварушаны камень”, занатую яго тут, у дзёньнікавым сшытку:

“Ён, круглы і замшэлы камень, падобны да млынавага, ляжаў зводдаль абгароджанага нізкім шчыкетнікам, новага драўлянага крыжа, пафарбаванага ў едка карычневы колер.

Пад блесткамі шурпатага лішаю хаваўся нечытэльны надпіс з адным толькі выразным словам: “Marja”. Калі і кім быў выбіты кароткі нечытэльны надпіс, невядома.

Толькі, як здалося падарожнаму, немаладому прыгорбленаму мужчыну ў сьветлым плашчыку і клятчатай кепачцы, камень быў зрушаны з таго месца, дзе ён раней ляжаў, а менавіта сярод вуліцы, што пераходзіла ў пясчаную дарогу”.

У дзёньнікавых запісах Мележа мова яшчэ вайскоўца, палітрука нават, з вайсковаю логікай, лексікай і рускай сінтаксічнай будовай (пабудовай) фразы. Гэта ўжо ад баявога ўстава ці інструкцыі.

Да “Людзей на балоце” ляжала нялёгкая цярніста-пакутная дарога, як на сваю Галгофу, каб устаць з мёртвых.

19.00. Маскоўскі Крэмль паволі, як мачавы пухір вадкасьцю, напаўняецца сьцёкамі з разьведкі — сёньня кіраўніком адміністрацыі прызначаны гэбіст Міхайлаў.

У Расеі, як паказваюць усе падзеі, адбыўся дзяржаўны пераварот — да ўлады прыйшлі тупалобыя сілавікі (войска, разьведка, міліцыя).

Яны, напэўна, прымусам і фальсіфікацыяй атрымаюць перамогу на прэзідэнцкіх выбарах. Бо ці канкурэнты ім два гарлапаны — Жырыноўскі і Зюганаў. (…).

Пятніца, 7 студзеня 2000 году.

9.00. Насьцярожана-маўклівая раніца з белымі паскамі сьнегу на карычневых і алавяна-мутных паласатых дахах. Поўны двор галубоў з гракамі і варонамі. Бо[м]жы яшчэ сьпяць ці мо калядуюць, бо на сьметніку адно птаства.

Яшчэ не ачуняў ад сваіх хваробаў. Перавернешся ў ложку, і ўсё, як у п'янага, да болю ў галаве ідзе кругам. Альбо нахілішся над сталом ці падымеш голаў — і павяло цябе. Адчуваеш сябе нечаканым інвалідам. Ці проста нікчэмным і бездапаможным.

Даведнік пра арыштаваных і асуджаных пасьля вайны органамі НКВД школьнікаў, якім было па 16 ці 17. Найбольш у Заходняй Беларусі, дзе тлела яшчэ нацыянальная самасьвядомасьць.

І мне прыгадваецца той непрытульна хмурны маёвы ранак, калі мы, падлеткі, дачуліся пра забраных ноччу трох ці чатырох старшакласьнікаў. Арышты прайшлі па ўсіх школах Дзятлаўскага і Навагрудскага раёнаў.

І помніцца той холад, які абліў грудзі. Мы, маладзейшыя, былі ў шоку. І кожны ў затоеным смутку падумаў пра сябе: мы на тры, на чатыры гады былі маладзейшыя за іх і гэтак сама, як яны, ненавідзелі і не ўспрымалі бальшавікоў. Мы таксама былі неадступныя і самаадданыя ворагі Расеі. І, вядома, заядлыя антысталіністы.

Але, як ведаю, колькі іх, нават маіх равесьнікаў, цярпліўцаў ці пакутнікаў сталінскіх перасыльных турмаў і лагераў, ня ўспомнена ў гэтым даведніку, як, напрыклад, група вучняў з Зецельшчыны, што стварыла падпольле і ўчыняла тэракты. Прыгадваецца і вучань Наваельненскай школы — Мароз.

Прозьвішча ў Цанавы незразумелае, дзікае і страхатлівае, як ён сам, — Джанджгава. Нешта ядавітае членістаногае. Папраўдзе, нібы мінгрэльскі скарпіён.

Якога ж багатыра ў лютым 40 году, у саракаградусны мароз з усёю сям'ёю пасадзілі ў таварны вагон і дэпартавалі ў Паўночны

Казахстан ці Заходнюю Сібір: “Лесник Крайник Иосиф Иванович. 1903 г. рождения, д. Лавриновичи Волковыского уезда, Зельвенской волости. 5 лет был лесником у одного из княжеских отпрысков магнатов Сапегов. В польской армии служил в 24–26 гг. в 3-м кавполку рядовым. Семья состояла из 4-х душ: жена Леонарда 1911 г. рождения, сыновья — Георгий (1935 г.) и Эдвард (1937 г.), дочь Юзефа, по национальности белорус. (Сам ён сьпецгрупай быў ужо, напэўна, арыштаваны — В.А.).

Земли имел 4 га, сенокоса — 0,15 га, неудобиц — 1 га, лошадь — 1, корова — 1, свиней — 1, дом деревянный, сарай — 1.

При обыске компрометирующих и к/р материалов не обнаружено.

Полковник Айрапетов (подп.). Ня ведаю, ці карысна перачытваць перачытанае, але гаркаты на душы і непамыснасьці застаецца шмат.

Іх, нешчасьлівых сем’яў, спачатку было каля дзесяці тысячаў, а потым, у сакавіку, пачаўся другі этап аперацыі.

На ліпень ці жнівень планаваўся трэці, але яго спыніла вайна.

Нелегальны чорны рынак немцы называлі schwarzer Markt. Там гандлявалі дражджамі, сахарынаю, мылам, сьпіртам ці самагонам, салам, цыгарэтамі. Усё з кошыкаў і чамаданаў, каб можна было ўцячы ў часе аблавы.

**denrat/

Dziennik Oberleutnanta Uhla:

“Чысьцім зброю і ровары. Прачэсваньне васьмі вёсак. Арыштавана 16 беларусаў, 3 беларускі і 2 палякі, а потым расстрэл іх у блізкім лесе. Потым злавілі 5 жыдоў”.

Субота, 8 студзеня 2000 году.

10.45. Не прасьвятлела ў галаве. Шум-звон у вушах. Павернеш рэзка галаву, асабліва лежачы, і акно замільгае, як вагон за вагонам, зьліваючыся ў адзін пас, калі перад табою праходзіць скоры цягнік.

Не памагаюць покуль што і таблеткі ксанцінола.

Хаджу, нібы ў глыбокай вадзе.

18.45. Выкупіў у “Падпісных выданьнях” пяты том Кнута Гамсуна. У ім — два салідныя раманы. Ня ведаю, калі прачытаюцца.

Толькі што загарнуў “Спадчыну” са шчыраю споведдзю двух лагернікаў — Алесі і Антося Фурсаў. Чамусьці прыгадваецца драма “Рамэа і Джульета” і той журботна балючы эпіграф да яе: “Няма аповесьці журлівейшай на сьвеце, чым аповесьць аб Рамэа і

Джульеце”.

Страшна ўсьведамляць і перажываць той цярністы шлях, які прайшла беларуская моладзь, звонячы кандаламі і шукаючы сваю так [і] няспраўджаную мару — беларускую незалежнасьць. Іх, вальнадумцаў-незалежнікаў, узьнёслых у сваіх парывах і памкненьнях, семнаццацігадовых юнакоў і юначак забівалі да сьмерці ў катоўнях дэфензівы, расстрэльвалі ў глухіх векавечных падвалах НКВД, душылі ў газавых камерах эсэсаўскіх канцлагераў.

Іх… Ой, Божа сьвяты, ці мала іх паплацілася маладым жыцьцём за нас, ня ўс[і]х вартых гэтай самаахвярнасьці.

20.30. Разумны кітаец Канфуцый калісьці вучыў: у маладосьці, калі шалее кроў і моцны дух, ухіляйся ад сварбы, у старасьці, калі стыне кроў і слабне дух, пазьбягай сквапнасьці. А я вось сёньня, ня могучы высока падняць голаў, агледзеў свае кніжныя паліцы, убачыў нямала непатрэбных для мяне выданьняў, але ніводнага томіка ня зьняў — пашкадаваў.

“Трэба ж іх падараваць, але каму?..” — і адышоўся.

Чорна-сівы, густавалосы Косьця Мазуркевіч/Мурзіч, узяўшы форму, якою яшчэ за польскім часам рабіў “пустакі” — пустацелыя цэментныя блокі яго бацька, паехаў на цаліну, спадзяваўся на вялікі[я] заработкі. Але, мусіць, прагадаў, вярнуўся дадому. Купіў каня і пачаў зьбіраць утыльсыр’ё — ператварыўся ў анучніка. З хутара прывёз воз кажухаў…

Ці адужаю, ці напішу такое апавяданьне? Дарэчы, ва ўсіх патаемных прапажах і загадкавых забойствах людзей, што здараліся ў мястэчку, падазрэньне падала на Косьцю Мазуркевіча (Мурзіча).

Нядзеля, 9 студзеня 2000 году.

Усё перад вачыма кружыцца зьлева направа па гадзіньнікавай стрэлцы. Галава цяжкая. Спазматычныя болі.

+3 °С. Адлега. З дахаў зьнік сьнег. І пад імі вісіць цяжкае, нудна сівае неба. Як радасьць — сарока, што, седзячы на тэлеантэне, блінкае доўгім хвастом, задзірае яго высока ўгару.

У маладосьці спадзявалася: жыць буду. Цяпер, у сталасьці, думаецца: а ці дажыву? Тады прыгадваліся тыя, хто быў на вышыні. І жаданьне было даляцець да іх.

Цяпер успамінаюцца тыя, хто адышоў і да каго ты вернешся.

У двары, нібы сьвіршчок, цьвіркае раз за разам, нечае “вольва” ці “опель”. Дзень шэры і цяжкі. Ляжымо, нібы камбала на

дне глыбіннага мора пад тоўшчай вады.

Прозьвішчы, якія прыдаліся б персанажам з маіх будучых навелаў:

Гардзель,
Дабрыян,
Даўгач,
Губар Вінцэсь,
Ёдчык,
Савіцкі Натан Хаімавіч,
Чамяроўскі Абрам,
Казарэз Юльян (Юлісь),
Лябецкі,
Жамойдзік Апанас,
Загадай Дзяніс,
Касіла Баляслаў,
Мілейка Адвард,
Сьліж Рудзік,
Саўрас,
Сворай,
Шчотка,
Шуляк.

Незадоўга перад сваёю сьмерцю маці ўспамінала, пэўна, сама халадзеючы сэрцам, як убіралі, кладучы ў труну, яе трохгадовую адзіную дачку: “Газавы валь (вуаль) з газавай кітайскай хусткі з кветкамі на рагу (ёй зрабілі). Белую сукенку з хвальбонамі пашылі”.

І я помню гэтую празрыстую ядвабную хустку, сінія губкі і блакітны папяровы венчык на лобе, калі ў настылай царкве стаяла адкрытая малая, караткаватая труна.

Успамінаю, і гарачыя, пякучыя сьлёзы замільгацелі/ мільгацяць на вачах.

Раней у Расіі праводзіліся чысткі, цяпер — зачысткі. Прынамсі, ці ўжо так далёка адышлася яна ад ідэй і прынцыпаў маніякальнага цыніка Сталіна. (…).

Панядзелак, 10 студзеня 2000 году.

9.10. +3 ˚С. Імжа. Мокрыя тлуста-блішчастыя дахі. На няроўным асфальце лужыны, у якія расплываюцца, расьцягваюцца ружовыя агні стоп-сігналаў. Прыбіральшчыцы, махаючы мётламі, ганяюць ад кантэйнераў з сьмецьцем зарослага рудаватаю барадою бамжа.

Чуюся трохі лепш. Можа, здароўе ідзе на папраўку. Хоць галава цяжкая і перад вачыма, калі рэзка павернешся, яшчэ

кружыцца сьвет.

І вось замігцеў ледзьве відушчы (відочны) сьняжок.

Дзякуй Далідовічу, ганарар з “Маладосці” атрымаў, здаецца, неблагі; ён роўны маёй пенсіі.Маладосьцеўцы яшчэ калядуюць — ходзяць пахісваючыся. А ў мяне і без гарэлкі кружыцца і баліць галава. Ня ведаю ўжо, чым ратавацца.

17.30. У сінявата-чорным, антрацытным вечары толькі глыбокія простакутнікі вокнаў з залаціста калючымі ліхтарамі. Дамоў/будынкаў не відаць, толькі абрысы даху з камінамі на сівым, трохі падсьвечаным небе. Прыгадалася вячэрняя школа, мая адзінота на жвірыстай шашы з ямамі, зьвінючы хруст абледзянелых бярэзінаў і мае сьветлыя думкі пра іншы, поўны хараства і велічы, неспазнаны бязьмежны сьвет.

З гадамі прасьцяг павузеў, усё спазнанае прызвычаілася, харство зьнікла, і застаўся той самы антрацытна-чорны вечар. Толькі прамень надзеі і спадзяваньня яго не (расьсячэ) праніжа.

Прышлы, будучы сьвет зрабіўся прошлым.

Ад двух зеленаватых “юпітэраў”, акружаных калючым арэолам, да мяне цягнуцца (у мяне ўпіваюцца) вострыя пучкі струнаў-праменьняў. Імі, ліхтарамі, на парусьніках асьвятляецца гандлёвы стадыён.

Аўторак, 11 студзеня 2000 году.

9.10. Хаджу, ледзьве рухаюся, нейкі змораны і нікчэмны. Кружыцца, як ты ляціш на каруселі, перад вачыма сьвет. Учора, лёгшы ў пасьцель, ня мог чытаць. Але думаў з упартасьцю: трэба змагацца са сьмерцю, трэба жыць.

Зноў абрыдлы звон у вушах.

Сухія дахі, карычневыя і алавяныя, з белымі прошвамі сьнегу. Адсланяючы сьвятло, трохі вышай падняліся сіва-ліловыя слаістыя хмары. І ранак сёньня весялейшы. (…).

У Ічкерыі — прарыў рускай блакады. Як мужна, аднак, змагаюцца непакорныя чачэнцы.

Маскоўскае тэлебачаньне фальшывіць і не падае праўдзівай інфармацыі. Яна прайшла толькі па інтэрнэце.

Мы адыдзем, і жыцьцё будзе ўсё далей і болей аддаляцца ад нашых сёньняшніх справаў, клопату, пакутаў. Новы дзень з яго трывогамі зацьміць наш сёньняшні, што стане ўжо ўчарашнім. Але я, дзівак, ды ці толькі я, ва ўсім учарашнім шукаю сёньняшняе і нават будучае. Колькі за астатнія дні перачытана дакументаў і

ўспамінаў з вайны і ня менш трагічнага — сталінскія высылкі і турмы — пасьляваеннага часу.

Трохі зьдзіўляе ці мо нават бянтэжыць, што знакаміты анг. філосаф Джон Лок быў заснавальнікам і акцыянерам ангельскага банку (1694 г.).

Серада, 12 студзеня 2000 году.

8.50. Ноч пакутаў, боляў, бяссоніцы. А цяпер — звон у вушах, цьвікі ў скронях. Зноў прамучуся дзень, ня могучы ўзяцца за апавяданьне.

Стаяў каля пліты (Ніна ўжо тыдзень ня варыць мне есьці), а ногі дрыжалі.

17.30. Прынёс ад сыноў бярэмя кніжак. Але найперш разгортваю “Гісторыкаў Грэцыі”.

У К. зашмат эпігонства, але ўсё роўна яго ставяць ледзьве ня поруч з Гамерам. Гэта ўжо патрыятызм вадзяніка ці палешука/палевіка.

Мае сыны, недасварыўшыся з жонкамі, сварацца чамусьці са мною ці, праўдзівей, спаганяюць на мне сваю злосьць. Тое ж самае адбылося і сёньня.

Быць сумленным — быць адзінокім, сказаў/падмеціў Макс Фрыш. Таму і пайшоў Б. за воплескамі і ўзнагародамі.

Вялікі Алівер Кромвель быў у маладыя гады футбалістам…

Нідзе і ні разу я ня ўжыў прозьвішча Хадар (адсюль — Хадаркевіч), было, здаецца, Ходас, за якое Пташнікаў дака[ра]ў мяне, што яно яўрэйскае. А вёска Ходасы ці Хадасы? На Наваградчыне?

Ёсць караімскае Хадыр (гатовы).

Кардаш — брат.

Карандас — сваяк.

Карайца — па-караімску.

Кара — чорны.

Бычак — нож.

Карга — варона.

Картай — старац.

Бошка — дарма, пустое, дарэмне.

Бузук — сапсаваны.

Будай — пшаніца.

Люблю людей, люблю природу,

Но не люблю ходить гулять,
И твёрдо знаю, что народу
Моих творений не понять.

І трэба ж, каб кніжка сама адгарнулася на гэтым вершы, але ўсё ж перамог, пераадолеў сябе і стаў чытаць далей, бо ўзяў з паліцы і паклаў на святло настольнай лямпы Уладыслава Хадасевіча. Вершы, вядома, пачаліся вышэйша[га] кшталту, але першага пачуцьця, што так гнятліва ўразіла і зьбянтэжыла, не разьвеялі. Чорная хмара недаверу вісела над усім зборнікам. У вершах, як у музыцы, першы недакладна ўзяты акорд парушае ўсю гармонію, увесь лад.

Чацьвер, 13 студзеня 2000 году.

9.00. Сонца ў вочы. Пасівелыя ад замаразку дахі. Чайкі, асьвечаныя сонцам, ляцяць з усходу на захад. –5 °С. Заміж сьнегу у дварах накарэлы лёд. Нібы прадвесьне. Хоць да яго яшчэ цэлая зіма.

Ноччу моцныя, як вытрываць, галаўныя болі. У вачах усё кружыцца, нібы падаю на той сьвет. Пачынаем думаць пра самае горшае.

Перад сном у віры галавакружэньня засаб прачытаў “Жыцьцё і маску” Шаляпіна, яго ўспаміны, выданыя ў Парыжы. І там жа пісьмо Горкага — Шаляпіна няма, ёсьць яго толькі цень — і хуліганска-разбойніцкі верш Маякоўскага.

Гэты[я] абодва рабы Сталіна так няшчадна маглі наўкруга сябе нішчыць усіх. Ня верыцца, але ж факт.

Пятніца, 14 студзеня 2000 году.

6.00. І сон не бярэ, і думак няма. Прыгадваецца штосьці дробнае і нязначнае. А можа ўсё, што перажыта, траціць сваю першапачатковую вартасьць і значнасьць. Нават вайна з яе невымоўна страшным трагізмам. Учора перачытваў інтэрв’ю з падпалкоўнікам юстыцыі, які ўдзельнічаў у судовым працэсе над забойцамі Хатыні, усімі гэтымі спачатку лейтэнантамі чырвонай, а потым фашыстоўскай арміі, усімі гэтымі васюрамі і мялешкамі, што расстрэльвалі і палілі людзей, тады маладымі і пазьвярынаму лютымі, а цяпер старымі, нікчэмна бяззубымі падсуднымі. Нянавісьці да іх няма, а ёсьць нешта іншае, больш значнае, страшнейшае і трывожнае, што гэта паўтараецца зноў і ў дзішэйшыя дні, у той жа Югаславіі і на тым жа Каўказе.10.15. Сонца белаватае, як у часе зацьменьня, і на яго, нібы дым, напаўзаюць хмары.

І вось яго няма, толькі сьветлаватая хмурнасьць, з якое пачала церусіцца белая манна.

Калі гавораць: а ў мяне недрукаванага няма, я прыгадваю рускага Пушкіна, яго найвыдатнейшыя п’есы ў вершах — “Меднага коньніка” і “Каменнага госьця”. Яны ўбачылі сьвет пасьля трагічнай сьмерці паэта. Як і яго матэрыялы, сабраныя да гісторыі Пятра Вялікага.

Нас усіх заядае драбяза жыцьця. І яна губіць нас, як згубіла Пушкіна. Пра што ў адным з лістоў пісаў Жукоўскі.

Субота, 15 студзеня 2000 году.

14.15. Камароўка. Манеж са шматгалосым вульлёвым гудам і лопатам галубоў. У мясных радах поўна цяляціны і сьвініны, але і цэны — не даступіцца.

Купіў аўсяных платкоў (шматкоў): яны яшчэ не падаражэлі.

За акном завіўся белы, як бабіна лета, і пухкі сьнег. У нядзелю і панядзелак, як пішуць газеты, задыміць кудаса і паваліць густы сьнег.

Прыгорбіліся, засумавалі на тэлеантэнах адзінокія вароны.

Халодны цыклон, што насунуўся з Фінляндыі, прынёс сёньняшнім ранкам шарых амялушак: іхняя чародка мільганула перад маім акном.

З люднага тралейбуса чамусьці запомнілася рухавая сівавалосая жанчына з ружаватым, без ніводнага зморшчыка тварам. Нават маладжавым. І пры ёй дзяўчына гадоў пятнаццаці-васемнаццаці. Трохі ўжо брыдчэйшая за маці, бо твар з курносым носікам здаваўся праставатым.

А сьнег тым часам плыве, ленавата і нехаця, і ўжо сівеюць, укрываючыся пухам, сухія дахі.

16.25. Які звужаны, які ўжо абмежаваны для мяне сьвет. І бачу яго найбольш з акна свае кватэры. Вось і цяпер: сівыя дахі за ім, сівое неба. Доўгая і рваная стужка чорных гракоў. Золата калючых лямпачак у глыбокіх, як падсьвечаны акварыум, вокнах далёкага дома. Дзяркаты венік голай таполі.

Прыгадаліся і ўбачыліся Друскенікі. Мае прагулянкі на бераг Нёману, што, зрабіўшы луку, хаваўся за надрэчнымі шарымі вербамі і карычнева-белым бярэзьнікам. Паволі цягнулася шырокая пасма зеленавата-каламутнай вады, на якую з шумам садзіліся імклівыя крыжанкі. Найболь[ш] паркамі. Выцягвалі перад сабою жоўтыя лапкі і ехалі па вадзе, як на водных лыжах.

Беларусы, перажыўшы страшную вайну, ня могуць перажыць свае векавое прыніжанасьці.

“Незалежнасьць — для нямногіх: гэта перавага моцных”, —

кажа Ніцшэ. Так няўжо ж мы, беларусы, так абнямоглі? Але, што ўтулілі голаў у плечы, гэта праўда.

Расія, як мачаха, і галубячы нас задушыць, Еўропа і ня любячы, як маці, не заб'е. Беларусь выйшла з Еўропы, і маці наша там.

22.35. Б'ецца сэрца, аддаючыся рытмічным рэхам у правым вуху. Чую ўдары бубна.

Нядзеля, 16 студзеня 2000 году.

5.30. Прыйшоў на кухню, каб паставіць і закіпяціць вады, і ўчуў, што ў дзьвярах паскрыпвае ручка. Нарэшце разабраў, што нехта спрабуе адамкнуць замок. Праз вочка ўбачыў мужчыну. Ён быў да бяспамяцтва п'яны. І ці не сусед? На голас мой ён не адклікаўся.

А ў мяне агнём гарыць галава, і ўсё кружыцца перад вачамі. Зноў нездароўчасьць.

5.50. У доме насупраць сьвеціцца калючай лямпачкай толькі адно акно, і пада мною з глухім буханьнем імчыць ужо з чыгуначнага вакзалу электрацягнік. Як прыходзіцца машыністу рана ўставаць.

Прыгадаўся варакомскі Бортнік, па мянушцы Керанка, што кожнае раніцы ішоў да прыгараднага, які ў шэсьць гадзін адпраўляўся з Наваельні ў Баранавічы. Там, у баранавіцкім дэпо, за 50–40 км ад дому, працавалі многія вясковыя мужчыны. І перад самымі Баранавічамі іх набіраўся цэлы цягнік. Варакомскія з наваельненскімі яшчэ забіраліся на верхнія паліцы, каб яшчэ даспаць — цягнік прыходзіў у Баранавічы праз дзьве гадзіны.

Якія смутныя, якія трывожныя, з прадчуваньнем блізкай сьмерці, дзёньнікавыя запісы А.Блока: "Не, ня трэба марыць пра Залаты век. Сьціснуць вусны і зноў пайсьці/адысьці ў свае дэманічныя сны. Усё будзе добра, Расея будзе вялікаю. Але як доўга чакаць і як цяжка дачакацца". Гэта запісана вясною і летам 1917 году. І мяне пад настрой зьняверанага Блока нешта нясьцерпна-трывожнае змушае таксама запісаць: усё будзе добра. Беларусь будзе незалежнаю. Але як цяжка і пакутна чакаць. І як доўга…

Сонца, ужо нават прыкметна высокае, не перадкаляднае, у валакністых хмарах. І ім падсьвечаны, плыве, пагойдваецца калматы сьнег. Забялелі, папрыгажэлі ржава-бляшаныя паласатыя дахі.

А на зьмену надвор'я — вострy боль у скронях.

21.45. Сьцягнуў шкарпэткі і бачу — апухлі ногі, костачкаў ужо не відаць.

Панядзелак, 17 студзеня 2000 году.

17.00. Хадзьба па крузе: “Энцыклапедыя” (падпісана дамова), “Полымя” (“Ноч на Галавасека” перанесена ўжо на трэці нумар), “ЛіМ” (аддаў машыністцы перадрукаваць “Трывушчую”). Ну, і па дарозе — гастраномы.

У сінім небе, высока на ўсходзе — малочны ліхтар месяца ў кудзерках падсьвечаных хмараў. Ноччу мае быць мароз. А цяпер — хлюпота, перагонамі волкі сьнег.

Аўторак, 18 студзеня 2000 году.

7.15. Згатаваў каву. Але нагнуўся, каб выцерці падлогу, і чуць ня рухнуў галавою ўніз — зноў перад вачыма закружыўся сьвет. Як абрыдлі мне мае хваробы. Ня ведаю, як уратавацца ад галавакружэньня, боляў у скронях і звону ў вушах — цынарызін не дапамагае. Ды якія таблеткі ўжо не ўжываю.

У лілова-сівых хмарах высокая ясна-блакітная шчыліна. Начны мароз утрымаў на д[а]хах вуграваты сьнег, што нацерушыўся ўчарашнім надвячоркам. Трэба было б разгортваць жоўты сшытак з пачатым ужо апавяданьнем пра Косьцю Мурзіча. Але імпэту, моцы занадта мала, каб перадужаць апатыю і нездароўчасьць.

З носу паказалася кроў і, як ў п’янага, парывы на рвоту.

10.20. За акном мігціць ледзьве відочны сьняжок. На градусьніку 0. Гарбатыя дахі спрэс белыя. Як глыбокая вада, цёмна-сіняватыя вокны. Засьнежаныя дрэвы ў дварах, чорныя ліпы і шара-зеленаватыя клёны.

Гэты мільгатлівы сьнег, белая зіма перанесьлі м[я]не ў засыпаную гурбамі Варакомшчыну 19-га стагоддзя, у паэму Янкі Купалы “Зімою”.

16.30. Хлюпата, разводдзе. А нанач, здаецца, пачало падмарожваць.

Завітаў да сыноў у офіс. Міраслаў з Вільні прывёз лякарства. Дамовіўся з Валодзем, што калі ў “Полымі” раптам пачнуць круціць носам, то “Ноч на Галавасека” аддам у “Arche”. Бо цяпер ва ўсіх рэдакцыях са шчылінаў, як шапаткія прусакі, вылезла і заварушыла вусікамі самацэнзура. Шабалін і Далідовіч ня ведалі, што ў мяне пакідаць, а што крэсьліць.

Нарэшце чарга дайшла да “Полымя”. Дарэчы, тут бальшавіцкая пільнасьць, прылашчаная Пташнікавым, ніколі ня зводзілася і глушыла ўсё, як сьмярдзючая сьнітка.

20.00. Паваліў густы калматы сьнег.

Заходзіла Наталя, расказвала пра розныя страсьці-мардасьці: іхнюю сваячку ці не сваячку зарэзаў каханак дачкі, што ўжо два разы сядзеў у турме. Яны яго ўсё прывячалі. Дачка, вярнуўшыся з навагодніх сьвятаў ажно другога студзеня, убачыла маці ўжо нежывою ў лужыне крыві. Дзьве нажавыя раны: адна ў поласьць жывата, другая — у сэрца.

Серада, 19 студзеня 2000 году.

10.00. Праз сваю нездароўчасьць (круціць, ломіць мяне ўсяго) ніяк не дайду да стала. –4 °C. Імгліць сьняжок. У высокіх разарваных хмар[ах], што наплываюць з поўначы, то вызірне, то схаваецца, то зьнікне сонца. Над дваром, над кантэйнерамі з сьмецьцем, учуўшы пад крылом тугі сіверны вецер, кружаць, планіруюць гракі. Ад пасьвятлелага дня балючая рэзь у вачах. Сонца ў калматых хмарах белаватае і вялікае, як перад заходам. І наўкруга яго ясна-ліловы арэол.

На сонцы іскрыць блёсткамі мігатлівы сьняжок. Белыя, у ледзьве прыкметных палосах, гарадскія дахі. Чорны грак кружыць перад акном. Шары дзяркаты топаль у засьнежаных ніжніх галінах. На сьметніку каля карычневых кантэйнераў топчуцца два мужчы[ны], разьдзіраючы кардонныя скрынкі. Пэўна, на макулатуру. А мне бачыцца Варакомшчына. Куст бэзу, абсыпаны чародкаю цьвіркатлівых вераб'ёў. І маці ў цяжкіх валёнках марудна ідзе ад гумна ў хату. Голыя, без рукавіцаў, рукі засунутыя на грудзях пад бурачковую камізэльку, апранутую на чырвоную кофту. На галаве — суконная, туга закручаная наўкруга шыі, сіваватая хустка. А за вуглом чуваць востры цюк і трэск — там недзе на калодцы бацька коле дровы…

Не, нікога няма. І хата, пэўна, замеценая нярушаным сьнегам, на якім не відаць ні сьцежкі, ні шнурка сьлядоў. Ужо васемнаццатую завейную зіму.

Зноў хадзьба па крузе: сьпярша "ЛіМ", дзе забраў перадрукаваную навелу, потым — "Полымя", дзе пакінуў яе, каб перадалі ў "Звязду", нарэшце — гастраномы.

Так мінуў пусты дзень, бо ніводнага радка на паперы не засталося. Не спрыяла здароўе, а перамагчы хваробы ня мог. Якую ж трэба мець дужасьць і моц, каб пераступіць цераз нямогласьць і пісаць.

Прозьвішчы:

Варывош (капыльскае),

Мясаед, Апалонік,

Серада, Груда,
Гаркач, Жур,
Семярнік, Чырвонка,
Дабрыян, Груша Антон,
Бусел Піліп, Міклаш,
Шастак, Харошка,
Сіняк, Дабрук,
Шышла, Сьліж,
Павачка, Ківуля Захар,
Даўгач, Ступак Арсен,
Мякіш, Раманюк,
Стырнік,
Мазоль,
Ярош-Яфімік,
Курачка Іван,

20.00. Высока [на] ўсходзе белая, трохі замурзаная поўня ў ясна-зеленаватай кароне. І на яе сіняватым дымам пачалі наплываць імклівыя хмары. Далей яны сівыя з цёмна-сінімі прагаламі (неба).

Ня ведаю, ці адпавядае гэта значэньню ў рускай мове, але па-польску (натрапіў у Аскара Колберга) лубянка азначае лубяны кораб, кошык, а ў пераносным значэньні — гняздо, дом.

Карэц — старапольская мера <не> збожжа, якая дзеліцца на 4 чвэрці і 32 гарцы.
Латка — булка. Ці не адсюль рус. латок.
Лісаваты — руды, рыжы.
Мудрагель — мудрык.
Бастард [неразб.] — байструк.
Добаш — музыкант.
Белакуры — яснавалосы.
Piecuch — лежабока, гультай.

Чацьвер, 20 студзеня 2000 году.
8.45. Устаў і ледзьве ня ўпаў каля ложка — так закружылася галава. Але вось ужо згатавана аўсянка. Дзякуй Богу, прыткнуўся да стала, і трэба будзе, пераадолеўшы хваробы, вычытаць і выправіць навелу “Ксёндз”, перадрукаваную ці, праўдзівей, набраную на камп’ютэры тры месяцы таму. Трэба нарэшце вызваліцца, каб пісаць далей “Косьцю Мазуркевіча”.
З кожным днём дужэе мароз. –8 °C. Ноччу пад поўню з чыстым небам было, мусіць, больш. За карычневым у белых

палосах сьнегу доўгім домам у сіва-ліловых хмарах гарыць празалота.

10.00. Нудзіць, ванітуе мяне. А сёньня пасьля сьнеданьня вырвала. І што за халера, адкуль узялася?

18.00. Людны — ні стаць, ні павярнуцца — тралейбус. Туды і назад. А паміж ім — “ЛіМ” (здаў апавяданьне “Ксёндз”), “Полымя” (успамінаў “Маладосць” Дамашэвіча і Кобец-Філімонаву, што дакляравала нас зарэзаць).

Пятніца, 21 студзеня 2000 году.

8.00. Пад завею, што зьмятае з дахаў учарашні сьнег, Чэсік ужо бяжыць у школу. Час пік. У транспарце — метро і тралейбусах — поўна народу.

Здаецца, –7 ˚С. Але праз нашэрхлы лёд на шыбе кепска распазнаю на градусьніку чырвоную рыску.

Хваробы мае не прайшлі. Хаджу па кватэры растапырыўшы/ распасьцёршы рукі, каб за што зачапіцца і ня ўпасьці.

Польская навелістыка для вызначэньня кароткага апавяданьня ўзяла амерыканскі тэрмін skitze. У нас было бядулеўскае абразкі і раённа-газетнае — карацелькі. Але яны не прышчапіліся, як першае, так і другое. Потым, ці ня з рускай мовы, прыйшло вызначэньне мініяцюры.

Але калі прыгадаць Багдановіча, то ў яго былі эцюды.

У філасофіі ёсьць дасьведчаньні, эсэ, афарызмы, максімы, эксьперыменты, пробы, міфы, абсурдныя развагі.М.Капыловіч перапісаў М.Прышвіна хоць пісьменна, а В.К., перапісваючы А.Камю, так наквэцаў, што да сэнсу ўжо не дайсьці. Гэта не абсурдныя развагі, а абсурдныя эксьперыменты ці, прынамсі, пераліцаваныя чужыя апраткі.

Б. усё сьвядомае жыцьцё займаецца, як палякі кажуць, чапкаваньнем: прыкленчвае, прыніжаецца, здымае шапку перад тым, хто стаіць за яго вышай на прыступку. Затое, як умее сьпіхаць і таўчы тых, хто аказаўся ніжай.

Субота, 22 студзеня 2000 году.

У палове дзявятай сонца, вялікае, нібы чырвоны надзьмуты шар, трымалася на тонкай трубцы тэлеантэны. Цяпер яно, белае, але таксама велікаватае, купаецца ў дымных хмарах, з якіх ужо набэрсаным “бабіным летам” безупынна плыве і пагойдваецца лёткі сьняжок. –11 ˚С.

Галава яшчэ затуманеная, хаджу пахісткваючыся. Хоць

“расклёвана” не адна палоска з алюміневай фальгі. Таблеткі, ампулкі, але нічога па-сапраўднаму не памагае.

Як бывае ні пазьдзекуецца над чалавекам лёс. Густаў Курбе, знакаміты французскі мастак, зрабіўшыся дзейным, неўтаймаваным членам Парыжскай камуны, як заюхлены бальшавік 17-га году, прапануе (выкінуць вон) разбурыць, зьнесьці Вандомскую калону. Ад яго, як ад галоты, таксама сьмярдзіць стойлам. А мы хочам, каб усё сьвятое ня нішчыла чэрнь.

Ізноў жа ня дзіва ці, праўдзівей, страшнае дзіва, што, рабуючы Рым, разбураючы сьвятыні і адсякаючы людзям галовы, ландскнехты — нямецкія пехацінцы імператара Карла V, узброеныя пікай, гэтай жа пікай накрамсалі імя Лютэра на фрэсцы Рафаэля. Пасьля гэтага Мікеланджэла, зьняважаны ўбачаным, намалюе свой “Страшны суд”. Адпомсьціць, чым можа, за люты зьдзек.

Мы ж, беларусы, “Страшнага суда” — праўдзівай помсты і кары над чужымі заваёўнікамі і сваімі прадаўцамі — яшчэ не ўчынілі.

Як, узяўшы на ўзброеньне эсэсаўскія карныя акцыі, рускае войска вынішчае Ічкерыю. Нават тэрміналогія, лексікон той самы — банды.

11.20. Цёплае на руках сонца. За акном іскрыць сьнег. І адсьвечвае, як сьлюда, сіняватымі блішчыкамі (блёсткамі) з блізкага даху.

Сіні цень у глыбокіх дварах. Двое мужчынаў (адзін пакручвае праз адчыненыя дзьверцы руль) падпіхаюць цяжкі бэжавы “мерседэс”, што заглух на марозе. Але вось засьвяціліся чырвона-жоўтыя стоп-сігналы — матор завёўся.

Белая кучма дыму над паласатым дахам. З аднога боку ён сіваваты.

14.00. Ня вецер, а разак. Такі калючы і пякучы. А зухаватая моладзь — хлопцы і дзяўчаты — бяз шапак. Мне, покуль дайшоў ад ГУМу да свайго дванаццатага дома, ледзьве не адмерзла левае вуха. Ці вухо, як у нас даўней казалі. Назапасіўся малаком і батонамі. Праўда, чэрствымі.

Да апавяданьня ніяк не дайду. Пэўна, выпісаўся ўчора.

І бываюць жа такія гіпнатызёры ці чараўнікі-прапаведнікі, ад прамоваў якіх ледзьве не вар’яцеюць разумныя і нязрушныя

людзі. Бо пасьля агністых і перуновых пропаведзяў манаха Саванаролы чысты душою і ня грэшны целам Леанарда пайшоў у дамініканскі кляштар (манастыр), а Батычэлі збавіўся ад язычніцкай ношы, якую ўзваліў яму на сьпіну гуманізм, і спаліў занадта “зямныя” палотны.

А колькі ж наўкруга нас такіх людзей ці нелюдзяў у чорных сутанах, што, услаўляючы божае харство і рай, штурхаюць нас у чорную прорву пекла, адкуль назад ужо дарогі няма.

16.15. Канчаецца дзень, асьвяціўшы ружовасьцю небасхіл і гарадскія карычневыя і мутна-цынкавыя дахі ў белых рваных пасках сьнегу. Каўкі імклівымі грумадкамі ляцяць нанач у парк на шарыя дрэвы.

Двое мужчынаў — адзін у вязаным каптурыку, нацягнутым на вушы, другі ў шапцы-вушанцы — вядуць пад пахі нізкую сутулую кабету ў лёгкім плашчавым паліто. Яна ледзьве ступае на правую нагу. Пэўна, упаўшы, падвярнула ці моцна пабіла яе.

16.25. У доме насупраць у цёмных вокнах ужо запаліліся тры залацістыя калючыя ліхтары. Не, ужо шэсьць. Націскаю на кнопку настольнай лямпы. У вочы пырскае і сьлепіць занадта зыркая стосьвяцовая лямпачка.

Згасла ясная ліловасьць на вечаровым небе, і яно зрабілася непрытульным шэра-папяловым. Вецер раскалыхвае дзяркатую верхавіну голага топаля і нясе, зьбівае чорных гракоў. І яны ляцяць неяк бокам.

Пішу і прыгадваю словы манаха Саванаролы: “Вы хочаце ўбачыць сапраўднае харство (прыгажосьць) — займіцеся вывучэньнем пабожнага чалавека…” А я цэлы дзень не дабяру хвіліны, каб паназіраць за сваім Косьцем Мазуркевічам і каб убачыць, як зьменіцца чало яго пад маім пяром. Усё гультую, займаючыся ўсім зямным і дробным.

Масьці коней: белы з сівым (шпак, шпакаваты), сіва-шэры, цёмна-чырвоны (руды), сівы (мышак), карычневы, цёмна-чырвоны (гняды), каштанавы (буланы).

Масьці кароў: чорная (ластаўка), палавая (ясна-жоўтая, як сьпелае жыта), пярэстая падласка (похвы белыя), чырвоная (вішня), зорка (з лысінкай на лбе).

Колер: папяловы (як неба перад зьмярканьнем), жары (ясна-чырвоны, агністы), паджары (з чырванаватым, рыжым жыватом), мурогі (цёмна-шэры), марагі (паласаты), расовы бык (племянны бык), дэраш (стракаты).

Сьцякаючы крывёю (бо рускія з гарматаў расстрэльваюць дамы, дзе туляцца жанчыны і дзеці), Грозны яшчэ змагаецца. Баевікі бяруць у палон нават генералаў.

Нядзеля, 23 студзеня 2000 году.

4.45. Нават ужо згатаваў чай. Ня сьплю з чатырох. Хоць належнага, глыбокага сну і не было. Ён перабіваўся дачнымі малюнкамі, дзе мы галасавалі па нейкіх картках за саюз з Расеяй, і на верталёце прылятаў сам Ельцын.

У двары цяжкі, натужна-падземны вуркат аўтамабіля, які нарэшце, нізка засьвяціўшы фарамі і рубінавымі стоп-сігналамі, выпаўз на косы завулак.

Хаджу па кватэры, як інвалід, асьцерагаючыся, каб мяне не пахіснула на стэлажы, дзе шмат шкла, і на люстраныя дзьверы ў калідоры.

Галавакружэньне яшчэ не прайшло, як не прайшлі спазматычныя болі ў скронях і цемені (цемі).

Пішу “Косьцю Мазуркевіча” і не ўяўляю, які выснуецца і вытчацца твор. Нешта ўсё раздвоілася.

Перада мною вырваная часопісная старонка з пісьмом Цішкі Гартнага з Ленінграду (1934 г.) да партыйных сакратароў Беларусі.

Западозраны ў нац. руху, выключаны з партыі, ужо, як казалі, сасьпелы вораг, каб нарэшце апынуцца ў катоўнях НКВД, ён, капыльскі гарбар, выцягнуты ў свой час на божы сьвет “Нашаю Ніваю”, піша ці, праўдзівей, даносіць, дзвэнгае на яе: “Я пісаў па-беларуску, і гэта зманіла мяне да супрацоўніцтва ў “Нашай Ніве”, у якой супрацоўнічалі, як пазьней даведаўся, нацыяналістычныя элементы — цяперашнія нацыянал-фашысты і шпіёны дэфензівы[”]. А там жа вядома ж хто быў — Янка Купала, Уласаў, Ластоўскі…

Страх пераходзіў у хваробу. Успаміналі, што Цішка Гартны ўжо [ў] мінскай “амерыканцы” хаваўся пад лаву і плакаў. Ня вытрымаўшы катаваньняў і допытаў, ён звар’яцеў. І гэта таксама страшна: і памёр у псіхіятрычнай бальніцы (у Печах пад Магілёвам). Там, кажуць, лячылі і сёньняшняга вар’ята (…).

Які неразгаданы і фатальны лёс дамоклавым мячом завіс над намі — мы зноў лезем у пашчу той самай забойчай імперыі, каб паміраць у Печах пад Магілёвам ці на Лубянцы.

Панядзелак, 24 студзеня 2000 году.

8.00. На чыстае неба сінявата-папяловымі мазкамі

наплываюць хмары. На шарым топалі чарнеюць надзьмутыя грак[і]. Мароз. –15 °С. Сіняваты дым ад каміноў ТЭЦ, як далёкія горы, засланяе ўсход сонца. Чэсік з цяжкаю, пакоўнаю сумкаю за плячыма недзе ўжо бяжыць у метро.

За клубкамі дыму загарэліся ў пякучы малінавы колер валакністыя хмаркі. Вышай яны дымна-ліловыя.

Над паласатымі дахамі нізка і натужна кудысь на поўдзень ляцяць гракі. Нялёгка ім перазімаваць зіму. Толькі каўкі, болей прызвычаеныя да халадоў, вясёла кружаць у двары, даганяючы ў лёце адна адну.

Ужо чырванаватым золатам засьвяціліся гарбатыя краі сіняга дыму, што марудна плыве над засьнежаным горадам, — узышло сонца. 8.15. І неба ў зеніце набыло ясна-блакітны, анёльскі колер.

Той хаты, дзе радзіўся, я ня помню.

Помніцца тая, ужо трохі абноўленая, якую дзед Тодар “перасыпаў”, дадаўшы колькі новых дзеравін. Яна згарэла ў вайну разам з нашаю новаю. У новай, аддзяліўшыся ад дзеда, мы пажылі няпоўны год — з восені саракавога да лета сорак першага.

Але ў маіх вачах стаяць яны абедзьве — адна шэрая, з патрэсканымі дзеравінамі за яловым пераплеценым частаколам, другая смолка-жоўтая за новым шчыкетавым (штакетавым) плотам. У іх абедзьве і трапіў запальны нямецкі снарад, падпаліўшы сухія акалотавыя стрэхі. Другі ўзарваўся ў сенях, сарваўшы дзьверы і дыхнуўшы ў хату смуродным тратылам. А ў хаце схаваліся мы, дзеці (пад печчу), і нашыя мацяркі.

За акном на сонцы, як калючы шкляны пыл, іскрыцца намаразь. Чамусьці яна віхрыць ня ўніз, а ўгору. Нібы хто б’е крэсівам па крэмені, высякаючы яе.

З коміну над цынкавым дахам у белых палосах уецца, курыць ня то сівы дым, ня то пара.

Аўторак, 25 студзеня 2000 году.

10.15. Ноччу сьніўся ўраган. Вецер быў такі моцны, што я ледзьве здужаў утрым[аць] дзьверы з пакою ў калідор. Іх ірвалі скразнякі. І так наўкола дома ўсё гуло, дрыжала, і так зьвінелі шыбы ў вокнах, што думалася, віхура пераверне дом. Але шыбы засталіся цэлымі, і вецер праз колькі парываў аціх. Дзень зноў быў поўны яснасьці, вышыні, спакою. Засталіся толькі ўспаміны.

10.30. З высокіх папяловых хмараў з белаватым сонцам і сінімі прагаламі (неба) сеецца пухкі лятучы сьняжок. На зьмену пагоды боль цісьне на цемя. Ці магчыма пісаць? –11 °С. Шчымяць у каленях ногі. Цягне ляжаць.

Калісьці Соф’я Андрэеўна Талстая (2.04.1898) запісала ў сваім дзёньніку: “…калі я жывая, займаюся мастацтвам, захапляюся музыкаю, кніжкаю, людзьмі, — тады мой муж нешчасьлівы, трывожны і сярдзіты. Калі ж я… шыю яму блузы, перапісваю і ціха, смутна завядаю (вяну) — ён спакойны і шчасьлівы, нават вясёлы…[”] І далей пакутная мальба і скарга: “І вось у чым мая сардэчная зламанасьць (ломка). Задушыць, у імя шчасьця мужа, усё жывое ў сабе, задушыць гарачы тэмперамент, заснуць і — ня жыць, а durer, як сказаў Сенека аб незьмястоўным жыцьці”.

Серада, 26 студзеня 2000 году.

9.00. Смутная, прыцішаная раніца з паласатымі, як тканая ў балонкі радзюжка, карычнева-белымі дахамі. Папяловае неба. У двары на чорнай, скалечанай ліпе сумуе прытоены грак. Чакае, як і я, недалёкай вясны. –13 ˚С.

Чытаючы “Бунтоўнага чалавека” Альбера Камю, вяду спрэчку, хоць з шмат якімі высновамі згаджаюся.

“Раней злачынства было адзінокім, як крык, цяпер яно такое універсальнае, як навука”. Згаджаюся, але што “самазабойства — гэта ўцёкі ад навакольнага сьвету”, няпраўда. Гэта перш збавіцца ад самога сябе, ад сваіх пакут, а не пакутаў сьвету.

І вось зноў спрэчнае: “Заявіць, што жыцьцё абсурднае, здольны толькі жывы сьвядомы чалавек”.

І ўсё ж жыцьцё не абсурд, а дзейнасьць, заключаная ў логіку і сэнс кругазвароту прыроды, неспазна[на]га яшчэ да канца сусьвету.

А Гітлер зьнішчаў сябе і наўкруга сябе нямецкі народ ня толькі таму, што ён быў вар’ят і злачынец, а што навакольны сьвет быў злачынны, і ў асобе Сталіна ён наткнуўся на звадыяша з больш халоднай крывёю. Па сутнасьці, загрудкі ўзяліся дзьве забойчыя сістэмы, і адна з іх нарэшце мусіла быць збаруканаю. Сістэма Сталіна, можа, больш жорсткая і прадуманая ў забойстве людзей, больш людажэрная, нарэшце перамагла. Самае страшнае, што ў гэтай вайне трыумфавала не дабро, а тая ж злавешчасьць.

(…)

Але ж калі я нарэшце, як Бальзак, нагаварыўшыся пра палітыку і лёс сьвету, вярнуся да больш сур’ёзных рэчаў — буду пісаць лёс Косьці Мазуркевіча. Апавяданьне, здаецца, прадуманае да канца. Але і яно акажацца страшным, як і папярэднія.

16.15. Сумны, прымерклы надвячорак. Адмахаліся над засьнежанымі дахамі чорныя гракі. Яны, прызвычаеныя рана

рыхтавацца нанач, рванай стужкаю сплылі ў парк. На косым завулку прыгорбленыя людзі ў скураных куртках і даўгаполых чорных кажухах. Першыя калючыя агні ў цёмных вокнах. І прыгадаліся два малыя аконцы ў нізкай, скіданай з круглай маладнічыны, кекшуковай крайняй хатцы. Я ў дванаццаць гадзін ночы варочаўся з мястэчка, з вячэрняй школы, у вёску і быў асьвечаны цёплай радасьцю, калі бачыў скупое, яшчэ ад керасінавай лямпы, святло ў чыіх-небудзь вокнах. А калі вёска без адзінага агоньчыка апускалася ў сон, у мігатлівую чарнату ночы, мяне агортваў смутак і халодная вусьцішнасьць падкрадвалася да сэрца.

Што значыў адзін скупы агоньчык у суседняй хаце.

Агоньчык — знак жыцьця і бяды.

16.45. Два зялёныя вокі глядзяць з сярэбранага ветразя над стадыёнам. Спадцішка падкралася шарая гадзіна.

Ня ведаю, як каму, а мне збрыдзеў і агорк Дом літаратара. Гармідар, пустая гамана. Разумнага слова там не пачуеш. Правінцыялізм, глушэча, абыякавасьць, апатыя…

Б., як па чарах ведзьмара, перарабіўся ў другога Пазьняка. Засталося хіба яшчэ напісаць лісьліва-ўгодлівыя лісты да нелюдзя і здрадніка, як гэта вычварыў (учыніў) той жа Пазьняк. Сьмяхота. Як кажуць, цырк на дроце.

Чацьвер, 27 студзеня 2000 году.

7.30. Тэмп майго жыцьця даволі марудны: покуль згатаваў чай, пасьнедаў, наглытаўся ампулаў і таблетак, прайшло паўгадзіны. Рассыпаўшыся, за горад ужо ляцяць каўкі з гракамі. Нізка, над самымі белымі дахамі (учора вечарам іх пабяліў лёгкі сьняжок). Папяловае неба, белыя дахі, і цяжкія ў лёце гракі. То набіраюць вышыню, то стрымгалоў падаюць уніз. +1 °C.

Персанажы ў аповесьцях Б. скрабуцца, шалпочуцца, нешта грызуць, як пацукі, а чагосьці блізкага табе, чалавечага ў іх няма. Ты за іх не перажываеш, ты не адчуваеш іхняга духоўнага сьвету, нават ня ведаеш, хто яны і адкуль яны. Папраўдзе — пацукі. Бязродныя, бязьдзетныя істоты. Ты, для прыкладу, ведаеш, хто ён, хітранькі парсючок Швейк, ці худы, як бясьсьмертны Кашчэй, жартаўлівы Кола Бруньён, не кажучы пра Міхала-пакутніка з “Новай зямлі”, а лейтэнант Х. з аповесьцяў Б. наглуха засакрэчаны, пашпартных даных у яго няма. Нават медальёна з нумарам часьці, каб павесіць перад боем на шыю, аўтар яму ня выдаў.

Пятніца, 28 студзеня 2000 году.

Учора агідны і самазабойчы дзень — маё выступленьне ў Доме літаратара.

Цісьне сэрца. Трэба шукаць валакардзін. За акном ветраны, адлежны з косым сьняжком дзень. Нібы на прадвесьні.

Як пража ў варштаце, мігціць пруткае гальлё на раскалыханым сохарані (таполі).

Субота, 29 студзеня 2000 году.

Ноччу пісьмо Б. Наўрад ці адпраўлю. Увесь дзень чытаньне дакументаў вайны. Успаміны нашых салдатаў (БКА, Самаахова), ад якіх тое-сёе запісаў.

Да прозы не дайшоў — нездароўчасьць.

Велешаноўны В.Б.!

Я па характары адкрыты чалавек. І ня вельмі жыву па добрай парадзе Сямі мудрацоў: не скрапляю слова пячаткаю маўчаньня. Болей таго, бываю нястрыманы на язык.

І мой ліст, напэўна, прыгучыць дысанансам у хоры агульнай маскоўска[й] пахвальбы, што выпала на тваю долю ў апошнія дні. Мушу растлумачыць: у дні, калі пачаўся anschluЯ Беларусі. Не, ты не працягнуў руку Маскве. Масква працягнула табе. І я, грэшны, падумаў: а што азначае гэты жэст? Зноў у векавечныя абдымкі з гэтак называным старэйшым братам ці фальшывым, напаўазіяцкім славянінам. Трыумф Б. у імперскай Расеі, якая прыгнятае, трымаючы ў жалезных путах, дзесяткі народаў, якія імкнуцца да незалежнасьці, агнём і мячом спапяляе Ічкерыю, а ў ідэалогіі перайшла на адкрытую, непрыхаваную гебельсаўскую прапаганду. Інфармацыйныя “зацемкі” з баявых дзеяньняў на Каўказе слова ў слова адпавядаюць рапартам былых казацкіх сотнікаў, што палілі і катавалі бел. народ у Навагрaдчыне вясною 1944 году. Там былі адпавед[н]а і бандыты, і тыя ж чысткі вёсак. Лексікон сёньня той жа.

Я разумею, гордасьць — гэта адзінота. Ты шукаў сабе падмогі і грунту пад нагамі. Ведаю пра тваю нездароўчасьць, твой неспакой, тваю тугу і самотнасць. І баюся, каб мой ліст не стаўся прычынаю, што пагоршыла б тваё самапачуцьцё і не зрушыла твой стан раўнавагі.

Ты зрабіў для Бацькаўшчыны як мага больш ці найбольш за ўсіх нас. Веліч твае хвалы і славы сягае далёка.

І хацелася б зьберагчы цябе, папярэджваючы аб першым хісткім кроку.

Моцы і здароўя табе, веры і надзеі, што ўваскрэсьнем.

Можа, я пасьпяшаўся з сваім непатрэбным і несправядліва катэгарычным лістом.

Але мудрэйшы за ўсё час, і ён, як казалі старажытныя, выявіць усё.

З найшчырэйшаю павагаю –

Вяч. Адамчык.

Ноч з 28 на 29 студзеня 2000 году.

Менск.

Нядзеля, 30 студзеня 2000 году.

Ноччу волкі сьнег сыпаўся на мяне і на мае ўспаміны. На перажытую вайну, цікавую ў сваіх пераменах, і вусьцішную нечаканымі пажарамі і сьмерцямі. На усё, што так беззваротна сплыло, як вада ў рэчцы.

І самае няўцешнае на гэтым сьвеце, што поруч з дабром нараджаецца і чалавечае зло.

Саюз бел. літаратараў — гэта збольшага саюз калабарантаў і ахоўных даносчыкаў — канфідэнтаў нападобе Ягодаў-Я. і С. з крывулямі К. Як праз гэтакі гушчар цемрашалаў церабіць дарогу да незалежнасьці?

А на гэтай дарозе скавычуць спушчаныя з ланцуга цэрберы з былой цэкоўскай падваротні, раз'юшаныя Ш., Н., П.

Леў Талстой пры сустрэчы з Леанідам Андрэевым прызнаваўся:

— Люблю п'яніц.

І не сказаў, за што.

А мне думаецца, за раскайваньне, за прыніжэньне, за мальбу, каб налілі яшчэ кілішак, за расхрыстанасьць душы, за тое, у чым цьвярозы чалавек ніколі не прызнаецца.

Прыгорбленая, трохі немаладая кабета ў зялёным паліто і жоўтым берэце напорыста дзяўбе белы, яшчэ ня рушаны на тратуарах сьнег.

З паласатага цынкавага даху доўгімі палотнамі папоўз сьнег, нібы яго хто сьцягвае і скручвае ў сувой. Адлега. У дымных, трохі ліловых хмарах белаватаю, месячнаю поўняю вызірае сонца. Паводзячы чорнымі хвастамі, па засьнежаным даху ходзяць вароны.

На шыбе ўнізе шнурок срэбных кропляў. Мільгае чародка неспакойных, нібы перапалоханых адлігаю, гілёў. Адсьвечваючы доўгімі струнамі, талая вада (з карнізу) дзяўбе падваконную бляху. І душа сама чакае нечага адлежна-сьветлага.

16.15. Водсьвет ліхтара, што схаваны пад брыльком пад'езда, трапечацца ў лужыне сярод двара, як касьнічок полымя. То падскоквае, выцягваецца, то меншае. Як агоньчык гарыць з краю лесу ў за[ла]цістую восень, калі ўжо можна накапаць і напячы бульбы. Вядома ж, чужое.

30 студзеня 2000 году.

16.20. Адлега. Нават, здаецца, цярушыць дождж. Вецер раскалыхвае пачарнелы мокры сохарань (топаль), за якім ужо ў цёмных вокнах зырка і калюча загарэліся першыя залацістыя лямпачкі ці жырандолі. Неяк бокам над нашым дваром, над тлуста мокрымі дахамі ляцяць у стары парк гракі. І вецер нясе туды папяловыя хмары з ледзьве прыкметнымі прасьветамі.

Душа, чуючы блізкі вечар, сьцішна замірае, прытойваецца, як птушаня ў гнязьдзе.

Шарая гадзіна. Выправіўшыся ёю ў дарогу, усе сьпяшаліся, каб быць дома, калі пачне сутоньвацца. Поначы застацца ў дарозе, можна выпадкам натрапіць на якую-небудзь нечаканасьць альбо нават бяду.

І мой бацька заўсёды са страхам успамінаў, як захапіла яго ў дарозе ноч. Ды ў дадатак, дарозе праз лес і незнаёмай. "Ідзеш, а на галаве шапка расьце". Дарэчы, бацька быў баязьлівы. "Пойдзем вечарам набраць у радзюжку калгаснай саломы, так ён баіцца, — сьмяялася маці. — Убачыць у поцемку слуп і кажа: чалавек стаіць".

Панядзелак, 31 студзеня 2000 году.

9.15. Белаватым размытым пятачком у сіва-ліловых хмарах сонца. Начны марозік сьцягнуў лужыны. Хрумсткі карабаты лёд на вуліцах.

Ноччу ня спалася. Галава налітая болем. Ці адужаю хваробы, каб дайсьці да апавяданьня?

Сарока выбрала самую верхавіну сохараня, каб аглядаць двары. А на крыжавінах тэлеантэнаў, што як вешкі стаяць на дахах дамоў, сумуюць вароны.

11.50. Зноў перачытваю архіўныя выпіскі. Цікавыя яны хіба ўжо тым, што вяртаюць мяне ў 45–46 гады, калі над намі забушавала сталінская навала з прымусовымі бясконцымі падаткамі, пазыкамі, нарыхтоўкамі, лесавывазкамі, калі ў склад сельвавецкага актыву, апрача ўпаўнаважаных ад кожнай вёскі, уваходзіў прадстаўнік НКВД. І помню лупаваценькага, хударлявага, у шынялі сталёвага колеру малодшага лейтэнанта

Фунта. І яго дробненькую, на ценькіх ножках, жонку. Яны хадзілі пад ручку, найбольш у нядзельныя дні.

Фунт, арыштаваўшы якога-небудзь дэзерціра, даваў магчымасьць яму ўцячы — пакідаў без нагляду ў сельсавеце.

Наўкруга, у прынёманскіх вёсках, хаваліся акоўцы альбо партызаны, што ня выйшлі з лесу і зрабіліся сапраўднымі рабаўнікамі, — і ён, пэўна, болей пабойваўся сам, чым той вясковы ці местачковы хлопец, што не пайшоў на савецкі фронт. Ноччу праз акно стралялі (савецкіх) бальшавіцкіх прыслужнікаў — старшыняў сельсаветаў, фінагентаў, упаўнаважаных вёскі ці солтысаў, як іх яшчэ называлі на даўнейшы лад.

Мне ўжо колькі гадоў карціць напісаць пра сельсавет, пра мае начныя дзяжурствы там за 100 рублёў, пра хворага на сухоты Чувака, сакратара, пра нач. вайскова-ўліковага стала Андросіка, пра старшыню Рудзька, былога, зьбітага каля Баранавічаў, лётчыка, з апаленымі рукамі і леваю шчакою, узброенага самадура і псіхапата, які ноччу правяраў, ці ня сьплю я. Званіў ён звычайна п'яным пасьля якой-небудзь раённай нарады. Страшна гразіўся і, як кожны савецкі начальнік, брыдкасловіў.

Ня менш каларытнаю фігураю быў участковы Шчарбак, што на работу зьяўляўся нападпітку, яшчэ з ранку, прыцемкам, абышоўшы ўсіх местачковых самагоншчыц.

Тармасіў ён для блізіру нібы ўсіх, нават прыводзіў і садзіў у пограб, не заўважаючы толькі, што ў доме з высокай падмуроўкай і ганкам, які стаяў на другі бок вуліцы і ледзьве не насупраць сельсавету, дрыготка віўся з коміну сіняваты лёгкі дымок. Сіпаватая, сутулая Аблажэіха, што хадзіла ў нейкіх атопках на босую нагу, кожнага дня гнала атрутны, з дамешкам сіняга каменю, пяршак. Дзябёлы, шыракаплечы і насаты, як Шылер, участковы, позьняй ноччу завітаўшы да Аблажэіхі, адужаў ажно літр, але з гасьціннага дому ўжо ня выйшаў. Тут жа, каля самагоннага апарата, і памёр.

Драбнюткай, мусьлінавай пражай за акном цягнецца, плыве сьнег і сівым пухам засьцілае дахі.

16.15. Абкураныя сьнегам чорныя ліпы, і ўжо мякка бялеюць дахі, а сьнег паціху сеецца і сеецца.

У І.Эрэнбурга сказ, які таксама прыгад[вае] тую казу, што закрычала нечалавечым голасам: "Наташа бежала к заводам; под ногами кричали осколки шкла".

Цытата з яго "Буры" і разьдзелу пра бамбёжку Менску. Сцэна трохі тэатральная, умоўная. А "пожилой человек тащил тюк с книгами". Гэта пра ўцёкі з палаючага Менску. Мог быць і такі

чалавек, але наўрад ці здаровы на голаў.

І неверагодны дыяпазон падзеяў: СССР, Нямеччына, Францыя, Англія…

Аднак пра найпершае і важнае. Мястэчка. Драўляны дамок пошты з тэлефоннай станцыяй па адзін бок калідора і канторай (два аконцы) — прыём карэспандэнцыяў і пасылак з бандэролямі — па другі. І ў канцы калідора пры закратаваным акне масіўная кабіна для міжгародніх перагавораў. А між ёю і акном, на сьцяне, зашклёная рамка з новымі выданьнямі. Там два часопісы. Аднак помніцца “Новый мир” № 8, 1947. Блакітная, з сіне-густым шрыфтам, тоўстая і для мяне, школьніка, зусім недаступная па цане кніжка. Мяне, тады прагнага да ўсяго новага, асабліва друкаванага слова, найбольш спакушала і цікавіла: а што там, за вокладкай, у зьмесце? Я, помніцца, упрасіў знаёмага хлопца ў цёмна-сіняй фуражцы паштовага работніка адкрыць зашклёную скрыначку. І ён зьліtаваўся — падаў мне ключык. Усхваляваная рука разгарнула часопіс, я нібы расчараваўся: “Илья Эренбург. Буря. Части пятая и шестая”. Аўтар аказаўся ня вельмі яшчэ мне знаёмы. Але зьбівала з тропу найперш загадкавае слова — “Буря”. Пра што гэта? Пра буран, віхуру, вецер? А прозьвішчы — Габлер, Рыхтэр.

— Ты ня купіш. Стаўляй на месца, — абрывае маю ўсхваляванасьць голас з зашалёванага аконца.

У адным са сваіх інтэрв’ю Жорж Сіменон прызнаўся: “Інтэрас маю, якім будзе 2000 год, як людзі сустрэнуць і чым адзначаць гэтую падзею, што чакае чалавецтва за парогам у трэцяе тысячагоддзе”.

А тым і адзначылі людзі трэцяе тысячагоддзе, што вядуць забойчую вайну ў Ічкерыі (Чачні). А Беларусь засыпана сьнегам і махлярствам.

Усё, як было шмат вякоў назад, каб паўтарыцца зноў. Вяртаньне пройдзенага, як кажуць.

“Я раманіст, — ганарыўся той жа Сіменон. — Раман — хто яго піша, ён яшчэ і Вызваленьне”.

Праўда, з 28-мі гадоў раманаў чужых ужо не чытаў, а толькі, здаецца, мемуары і эпісталярыі.

І пісаў свае дэтэктывы за адзінаццаць дзён, выдаючы на-гара за дзьве гадзіны дваццаць старонак машынапіснага тэксту.

Цікава, за стол садзіўся ранютка і яшчэ нашча.

А мне, грэшнаму няўмеку, патрэбна кароткая разьбежка — дзёньнік. А бывае, што кароткая разьбежка забярэ і захопіць увесь доўгі дзень.

Але я ўжо бяз дзёньніка не магу, як той жа Жорж Сіменон бяз

файкі (люлькі).

І яшчэ адно: ён любіў маніфестантаў, як называлі іх — “доўгавалосую свалату з бруднымі пазногцямі”.

Тут у нас, як кажуць, поўная згода. Я ня толькі паважаю маніфестантаў, але і сам бываю на мітынгах і пікетах. Маніфестанты ў Беларусі самая сьвядомая і адукаваная частка моладзі. Усе астатнія збольшага пакорныя калабаранты альбо чыста прадаўцы.

Друкуецца са скарачэньнямі. Падрыхтаваў да публікацыі — М. В. Адамчык.